Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 119 (28229) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Спёка ідзе...

СТАР. 15



Цікавыя моманты Еўра-2016

СТАР. 16



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір АРЛОЎСКІ, першы намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта:**

*«Па ініцыятыве Мытнага камітэта сумесна з пагранічнай службай у шасці беларускіх пунктах пропуску на мяжы з Літвой, Латвіяй і Польшчай з чэрвеня гэтага года замест папяровых кантрольных талонаў уведзена ў рэжым доследнай эксплуатацыі аўтаматызаваная сістэма ўліку пропуску фізічных асоб, транспартных сродкаў і тавараў. Гэтая тэхналогія дазваляе ўдасканаліць працэс праходжання мяжы, зрабіць яго больш аўтаматызаваным, сучасным і зручным».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.06.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19801,00 | ▲ |
| Еўра | 22426,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 308,06 | ▼ |
| Укр. грыўня | 795,66 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Асілкі для хлебаробаў



Фота БЕЛТА.

Учора ў механізатараў з Віцебскай вобласці быў асаблівы дзень. У сталіцы, ля Мінскага трактарнага завода, ім уручылі ключы ад дзесяці новенькіх трактароў «Беларус 3522». Магутныя сучасныя машыны будуць працаваць на палях у розных раёнах поўначы краіны. Напрыклад, у ААТ «Лаўжанскае» Шумілінскага раёна — механізатар гаспадаркі Андрэй КАХАЕЎ прыехаў на МТЗ забраць свайго жалезнага памочніка.

## ПЯЦІГОДКА: мэты і прыярытэты

**Галоўная мэта развіцця Беларусі на 2016-2020 гады - павышэнне якасці жыцця насельніцтва.**

**У 2020 годзе прырост да 2015 года складзе:**

| | |
|---|---|
| ВУП | 12,1-15% |
| прадукцыйнасці працы па ВУП | 12,8 - 15,1% |
| выпуску прадукцыі прамысловасці | 9,1 - 15,2% |
| выпуску прадукцыі сельскай гаспадаркі | 12,6 - 15% |
| інвестыцый у асноўны капітал | 12 - 14,9% |
| экспарту тавараў і паслуг | 21-25% |
| рэальных грашовых даходаў грамадзян | 9,5 - 11,6% |

За пяцігодку плануецца пабудаваць **звыш 18 млн кв.м** жылля.

**Для дасягнення пастаўленых мэт развіццё краіны будзе грунтавацца на ключавых прыярытэтах:**

ІНВЕСТЫЦЫІ, ЗАНЯТАСЦЬ, ЭКСПАРТ, ІНФАРМАТЫЗАЦЫЯ, МОЛАДЗЬ

Крыніца: Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016-2020 гады, адобраная дэлегатамі пятага Усебеларускага народнага сходу.

© Інфаграфіка БЕЛТА

# Улічыць усё

**Пяты Усебеларускі народны сход учора завяршыў сваю работу. Дэлегаты плённа папрацавалі, выказалі свае думкі наконт таго, як развівацца дзяржаве, якія сферы стануць у гэтай пяцігодцы вядучымі, пра што трэба паклапаціцца — бо інакш страчанага не вернеш. Прыцягненне інвестыцый, інавацыі, экспарт, развіццё прыватнай ініцыятывы, міралюбівая знешняя палітыка, Год культуры, ахова здароўя, сацыяльная абарона, развіццё малых вёсак — гэта толькі некаторыя з пытанняў, што падымаліся на сходзе.**

**У выніку дзве з паловай тысячы дэлегатаў ухвалілі праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады.**

СТАР. 2–4

# Шлях, які належыць прайсці

## Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады стане асновай для прыняцця рашэнняў у далейшым

**Пра гэта ў заключным слове на V Усебеларускім народным сходзе заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.**

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што праграмай толькі намечаны шляхі, па якіх краіна зможа рухацца да пастаўленых мэт. «Паколькі жыццё вельмі разнастайнае, узнікне яшчэ маса іншых пытанняў. Нам давядзецца прымаць мноства рашэнняў па-за межамі гэтай праграмы, вядома, грунтуючыся на яе палажэннях», — падкрэсліў Прэзідэнт і запатрабаваў мець гэта на ўвазе і шырэй глядзець на пастаўленыя задачы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што Усебеларускі сход адбыўся ў адказны перыяд — напярэдадні парламенцкіх выбараў, якія таксама акажуць значны ўплыў на далейшы лёс краіны. «Хачу цвёрда заявіць: ніхто, акрамя беларускага народа, не можа вырашаць, як яму жыць, як развівацца, якім законам быць на нашай зямлі і якім будзе парламент і іншыя органы ўлады. Толькі беларускі народ будзе вызначаць яго», — нагадаў кіраўнік дзяржавы.

Падводзячы вынікі пятага Усебеларускага сходу, Прэзідэнт адзначыў, што форум з усёй відавочнасцю паказаў, што народаўладдзе з'яўляецца найважнейшым інструментам прыняцця лёсавызначальных рашэнняў у Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў усім адказным за арганізацыю і правядзенне Усебеларускага сходу, а таксама дэлегатам — за падтрымку, разуменне, актыўны ўдзел у распрацоўцы і прыняцці праграмных дакументаў. На форуме была зацверджана доўгатэрміновая стратэгія развіцця краіны, выпрацаваны асноўныя напрамкі інавацыйнага абнаўлення, мадэрнізацыі эканомікі з улікам новых сусветных тэндэнцый, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Дэлегаты аднагалосна прынялі рэзалюцыю пятага Усебеларускага народнага сходу і зварот яго ўдзельнікаў да суайчыннікаў.

Праблематыка і дух Усебеларускага сходу, як адзначыў кіраўнік дзяржавы, павінны стаць прадметам абмеркавання ва ўсіх рэгіёнах, калектывах, каб уся краіна мабілізавала матэрыяльныя і інтэлектуальныя сілы на рашэнне пастаўленых задач. Прэзідэнт папрасіў дэлегатаў разам з дэпутатамі, кіраўнікамі прадпрыемстваў і арганізацый належным чынам правесці гэту работу на месцах. Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу пракантраляваць выкананне прынятых на Усебеларускім сходзе рашэнняў, акцэнтаваў увагу на тым, што грамадзяне, якія звярталіся на гарачую лінію форуму, павінны атрымаць адказы на свае пытанні.

Завяршаючы сваё выступленне, Прэзідэнт пажадаў усім удзельнікам форуму шчасця, поспехаў, дабрабыту і працвітання.

■ Меркаванні

# РАЗМОВА БЕЗ ПАСРЭДНІКАЎ






**Наталля КАЧАНАВА, намеснік прэм'ер-міністра Беларусі:**

— У выступленні кіраўніка дзяржавы былі дакладна расстаўленыя акцэнты ў перспектывах развіцця нашай краіны ў бліжэйшае пяцігоддзе. Для мяне было важна пачуць тыя пытанні, якія тычыліся, перш за ўсё, сацыяльнай палітыкі дзяржавы. У той жа час былі цікавымі меркаванні дэлегатаў, якія казалі пра праблемы: нам яшчэ давядзецца іх вырашаць.

Дэлегатамі сходу абраны прадстаўнікі розных рэгіёнаў краіны. Гэта тыя, хто сёння прадстаўляе вобласці і найбольш актыўна ўдзельнічае ў жыцці краіны. Безумоўна, такі непасрэдны дыялог, жывая сувязь з рэгіёнамі даюць свае станоўчыя вынікі. Я з задавальненнем слухала прамоўцаў. Асабліва мне былі даспадобы выступленні студэнткі БДУІРа і прадстаўніка рабочай прафесіі — маляра з Гомельскай вобласці.

Акрамя таго, нам важна было пачуць пажаданні, прапановы, меркаванні, якія паступалі ад тых, хто дазваніся па «гарачай лініі». Мы ўжо сабралі іх, і амаль усе яны былі асабістага, сямейнага плана. Для сябе чарговы раз зрабіла выснову, што прынятыя ў сацыяльнай сферы заканадаўчыя акты слушныя і дакладныя.



**Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ПАВЕЛ, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі:**

— Важна, што на такім форуме, які адбываецца ў гэтыя дні, кожны можа выказаць свае думкі, прапановы, што варта зрабіць, каб краіна развівалася далей і людзям жылося лепей. Мне спадабаліся выступленні і дэлегатаў, і Прэзідэнта, які агучыў прыярытэты развіцця дзяржавы ў эканамічным, палітычным, аграрным, культурным і сацыяльным планах.

Што зменіцца ў наступныя пяць гадоў у жыцці Беларускай Праваслаўнай Царквы? Не заўсёды патрэбны кардынальныя змены. Сёння найлепшая навіна — гэта адсутнасць навін. І тое, што зараз у Царкве няма вострых пытанняў, добра. Чаго нельга сказаць аб тым, што цяпер адбываецца на Крыце, дзе засядаюць праваслаўныя іерархі (Там адбываецца ўпершыню больш чым за тысячу гадоў Усеправаслаўны сабор, на якім з-за арганізацыйных рознагалоссяў не прысутнічаюць асобныя Цэрквы, у тым ліку Руская. — **Заўвага рэд.**). Там ёсць такія пытанні, якія ў спешцы не вырашаюцца. Наша Царква прапанавала перанесці Сабор. Каб усё было ўзважана і абмеркавана. Бо ў пытаннях багаслоўя спешкі не павінна быць. У 1961 годзе, калі адбывалася І Усеправаслаўнае пасяджэнне, было прапанавана разгледзець 100 пытанняў, а ў сёлетнім — толькі 6. Тысячу гадоў чакалі, нашто цяпер спяшацца?



**Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў:**

— Мяркую, форму Усебеларускага народнага сходу трэба развіваць. Акрамя такіх дзён пасяджэнняў, як гэтыя два, праводзіць пасяджэнні і па секцыях, дзе маглі б выступаць прадстаўнікі ўрада, весці дыялог. І тады, магчыма, мы, дэлегаты, больш канцэнтравана агучвалі б пазіцыю цэлых галін з пункту гледжання не толькі свайго прадпрыемства ці асобнага раёна, але і ўсіх тых людзей, якія працуюць у гэтай сістэме ці галіне. Таму я думаю, што тут ёсць куды расці. У тым ліку больш шырокія дыскусіі напярэдадні гэтага мерапрыемства анлайн і цяпер маглі б ажыццяўляцца.

У дні сходу я звярнула ўвагу на развіццё электроннай Беларусі. Па шчырасці, мяне зацікавіла больш за ўсё адно палажэнне, якое дазволіць нам мадэрнізаваць галасаванне, бо ў праграме адзначаецца, што да 2020 года ў кожнага грамадзяніна павінен быць электронны подпіс. Як усе прафесійныя людзі, я шукаю тое, што можа быць выкарыстана менавіта ў блізкай мне сферы.

Фота БЕЛТА

■

# ЗВАРОТ УДЗЕЛЬНІКАЎ

## ПЯТАГА УСЕБЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА СХОДУ ДА СУАЙЧЫННІКАЎ

### Разам — за моцную і квітнеючую Беларусь!

**Дарагія суайчыннікі!**

Чвэрць стагоддзя мы жывём у свабоднай, суверэннай і незалежнай Рэспубліцы Беларусь. Гэта перыяд станаўлення нашай дзяржавы, калі нам давялося пераадольваць наступствы аварыі на Чарнобыльскай АЭС, распаду Савецкага Саюза, адводзіць краіну ад бездані і закладваць падмурак для будучыні. Мы мадэрнізавалі традыцыйныя галіны і стварылі аснову для развіцця новых высокатэхналагічных галін.

Сход выказвае вялікую ўдзячнасць беларускаму народу, яго самаадданай працы і клопату аб нашым агульным доме.

Нягледзячы на пэўныя складанасці ў эканоміцы, мы захоўваем сацыяльна-палітычную стабільнасць у грамадстве. Наша галоўнае дасягненне — мір, спакой і ўпэўненасць у заўтрашнім дні, якія мы з гонарам перадаём новаму пакаленню грамадзян незалежнай Беларусі.

Надзейны падмурак, створаны за папярэднія дзесяцігоддзі, дазваляе падняць эканоміку Беларусі на новыя рубяжы і наблізіць якасць жыцця насельніцтва да ўзроўню самых развітых краін свету. Ухваліўшы асноўныя палажэнні Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады, мы адводзім вырашальную ролю ва ўстойлівым развіцці краіны чалавечаму капіталу і інавацыям.

Згуртаванасць грамадства ў вырашэнні адказных задач з'яўляецца гарантыяй дасягнення пастаўленых мэт і паспяховага развіцця краіны.

У будучы пяцігадовы перыяд нам трэба будзе ўзмацніць пазіцыі Беларусі на традыцыйных рынках і асвоіць новыя, дынамічна нарошчваючы свой эканамічны патэнцыял, умацоўваючы супрацоўніцтва і ўзаемавыгаднае партнёрства з усімі краінамі на раўнапраўнай аснове.

Нам важна прадоўжыць рух наперад, абапіраючыся на ранейшыя дасягненні і набыты вопыт. Беларусь уступае ў новы этап сусветнага развіцця — перыяд інавацый, тэхналагічных прарываў і ідэй.

Трэба будзе рэалізаваць новыя падыходы да кіравання эканомікай, якія дадуць вынік у яе абнаўленні, павышэнні эфектыўнасці гаспадарання і прадукцыйнасці працы, зніжэнні вытворчых выдаткаў, павышэнні якасці вырабленай у Беларусі прадукцыі, павелічэнні долі інавацыйных складнікаў у ёй і забяспечаць прыток замежных інвестыцый.

Чалавек, яго ініцыятыва, талент і прадпрымальнасць павінны стаць галоўнай рухаючай сілай развіцця краіны.

Сацыяльная накіраванасць эканомікі будзе захаваная. Асноўнымі індыкатарамі ў гэтай сферы стануць рост дабрабыту людзей, паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі, умацаванне здароўя насельніцтва, развіццё сістэмы адраснай сацыяльнай дапамогі.

Мэтанакіраваныя захады актыўнай дзяржаўнай палітыкі на міжнароднай арэне закліканы забяспечыць зніжэнне залежнасці эканомікі Рэспублікі Беларусь ад знешнеэканамічнай кан'юнктуры.

**Паважаныя суграмадзяне!**

Дэлегаты пятага Усебеларускага народнага сходу перакананы, што беларускі народ зробіць правільны выбар нашай агульнай будучыні на маючых адбыцца парламенцкіх выбарах.

Нам трэба будзе ўвасобіць рашэнні, прадугледжаныя ў Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2016—2020 гады, і забяспечыць кожнаму чалавеку магчымасць зарабіць на годнае жыццё сумленнай працай.

Мы моцны духам народ і справімся з любымі цяжкасцямі на шляху да мэт дынамічнага развіцця нашай любімай Беларусі.

# РЭЗАЛЮЦЫЯ

## ПЯТАГА УСЕБЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА СХОДУ

### Разам — за моцную і квітнеючую Беларусь!

Мы, паўнапраўныя прадстаўнікі народа Рэспублікі Беларусь, грунтуючыся на канстытуцыйных прынцыпах народаўладдзя, усведамляючы сваю адказнасць за будучыню нашай краіны, пастанаўляем:

1. Прызнаць, што рэалізацыя Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011—2015 гады забяспечыла ў краіне захаванне палітычнай стабільнасці, устойлівасці эканомікі і сацыяльнай абароны насельніцтва.

По індэксе чалавечага развіцця Рэспубліка Беларусь сярод 188 краін сусветнай супольнасці перамясцілася з 68-га месца ў 2000 годзе на 50-е месца ў адпаведнасці з выніковым дакладам ААН 2015 года. Сёння Беларусь уваходзіць у групу краін з высокім узроўнем чалавечага развіцця.

Павысіліся памеры сацыяльных гарантый і даходаў насельніцтва, што дазволіла знізіць долю малазабяспечаных з 7,3 працэнта ў 2011 годзе да 5,1 працэнта ў 2015 годзе.

Істотна палепшылася дэмаграфія. З 2014 года ўпершыню за апошнія дваццаць гадоў колькасць жыхароў у рэспубліцы пачала расці. Сціснуліся дэмаграфічныя нажніцы.

Валавы ўнутраны прадукт на душу насельніцтва па парытэце пакупніцкай здольнасці вырас з 15,4 тыс. долараў ЗША ў 2010 годзе да 17,7 тыс. долараў ЗША ў 2015 годзе.

Аднак з-за шэрагу негатыўных знешніх і ўнутраных фактараў асноўныя прагнозныя паказчыкі не былі дасягнуты. Агульныя тэмпы развіцця краіны да канца пяцігодкі склаліся ніжэй за запланаваны ўзровень. Гэта запатрабавала прыняцця ўзважаных комплексных мер па пераадоленні негатыўных тэндэнцый. Новая пяцігадовая праграма накіравана на фарміраванне ўмоў устойлівага развіцця краіны.

2. Адобрыць асноўныя палажэнні Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады і падтрымаць яе галоўную мэту — павышэнне якасці жыцця насельніцтва на аснове росту канкурэнтаздольнасці эканомікі, прыцягнення інвестыцый і інавацыйнага развіцця. Для яе дасягнення будуць рэалізаваны наступныя асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны:

інвестыцыі, якія стымулююць рост прадукцыйнасці працы, стварэнне новых працоўных месцаў і фарміраванне цэнтраў апераджальнага рэгіянальнага развіцця;

забеспячэнне на гэтай аснове эфектыўнай занятасці людзей і развіцця чалавечага патэнцыялу;

рост і дыверсіфікацыя экспарту тавараў і паслуг, забеспячэнне збалансаванасці знешняга гандлю;

развіццё інфармацыйнага грамадства і шырокае ўкараненне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій;

усебаковае раскрыццё патэнцыялу моладзі і яе актыўная роля ва ўмацаванні дзяржавы.

Базавым фактарам эканамічнага развіцця ў наступнае пяцігоддзе з'яўляецца павышэнне эфектыўнасці кіравання на ўсіх узроўнях, у тым ліку шляхам аптымізацыі функцый дзяржапарату і структуры дзяржаўных актываў.

Заахвочванне ініцыятывы і падтрымка прадпрымальніцтва будуць спрыяць стварэнню новых працоўных месцаў, росту дабрабыту грамадзян і іх самарэалізацыі ў інтарэсах беларускага грамадства.

3. Даручыць дзяржаўным органам прыняць вычарпальныя меры па дасягненні пастаўленай мэты і рэалізацыі прыярытэтных напрамкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця шляхам паляпшэння інстытуцыйнага асяроддзя, змены галіновай і тэхналагічнай структуры эканомікі, павышэння эфектыўнасці дзяржаўнага кіравання і занятасці насельніцтва, зніжэння затрат на вытворчасць прадукцыі, развіцця прыватнага сектара і павышэння яго ўнёску ў эканоміку, поўнай рэалізацыі патэнцыялу супрацоўніцтва з усімі краінамі свету, усебаковага ўдзелу ў станаўленні Еўразійскага эканамічнага саюза.

4. Лічыць ключавой задачай пяцігоддзя аднаўленне і забеспячэнне далейшага ўстойлівага эканамічнага росту як асновы для паспяховага жыцця будучых пакаленняў.

5. У трохдзённы тэрмін накіраваць гэту рэзалюцыю кіраўніку дзяржавы для разгляду і прыняцця неабходных рашэнняў.

# ЗАДАЧЫ ПАСТАЎЛЕНЫ

## Цяпер толькі працаваць

**На пачатку другога дня пятага Усебеларускага народнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прастаўнікоў Нацыянальнага сходу, павіншаваў тых дэлегатаў сходу, хто 23 чэрвеня святкаваў свой дзень нараджэння. Спікер пажадаў ім дабрабыту і поспехаў. У цэлым жа для выступленняў учора запісаліся 27 чалавек.**

### У чым сэнс навукі

**Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі**, звярнуў увагу на тое, што ў сваім дакладзе Прэзідэнт вялікую ўвагу надаў навуцы і інавацыям.

— Мы за гэта ўдзячны, — сказаў ён. — Сэнс навукі — служыць грамадству.

Уладзімір Гусакоў паведаміў, што за апошнія гады Акадэмія навук аптымізавала праграмы сваіх навуковых даследаванняў — іх тэматыка звязана з задачамі вытворчасці. Па словах старшыні прэзідыума НАН, цяпер навука ў большай ступені нацэлена на атрыманне прыбытку, забяспечана шырокае ўкараненне навуковых распрацовак.

— Ад нас перасталі з'язджаць маладыя навукоўцы; наадварот, у нашу краіну едуць замежныя партнёры і ахвотна працуюць з нашымі вучонымі, — канстатаваў Уладзімір Гусакоў.

Сярод найбольш вядомых і значных распрацовак айчынных навукоўцаў — новы беларускі спадарожнік дыстанцыйнага зандзіравання, над якім вучоныя працуюць цяпер. Нашы распрацоўшчыкі змадэліравалі першы модуль Беларускай антарктычнай станцыі, асвойваюць новую лінейку суперсучасных шматфункцыянальных беспілотных лятальных комплексаў, адпрацоўваюць 3D-друк для розных сфер навукі і практыкі.

Каментуючы выступленне старшыні прэзідыума НАН, **Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр ЛУКАШЭНКА** падкрэсліў галоўную ролю Нацыянальнай акадэміі навук ва ўкараненні інавацый у вытворчасць. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што ў апошні час праца НАН кардынальна змянілася. Навукоўцы пачалі займацца найноўшымі напрамкамі, такімі як нана- і біятэхналогіі, заняліся вытворчасцю, напрыклад беспілотнікаў.

Прэзідэнт нагадаў, што ім было прынята адназначнае рашэнне для таго, каб ліквідаваць праблемы з укараненнем навуковых распрацовак. Калі навукоўцы стварылі і прапануюць у вытворчасць тую ці іншую прадукцыю, то прадпрыемства не мае права адмовіцца.

— Раз навукоўцы вынайшлі, трэба гэта апрабіраваць і ўкараняць, — сказаў Прэзідэнт.

### Каб малыя вёскі не зніклі з карты

**Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў**, адзначыў, што дэлегацыя Віцебскай вобласці прыехала на сход з нядрэннымі вынікамі. Гэта ўнёсак як кіраўнікоў, так і простых працаўнікоў. Тым не менш расслабляцца не варта — наперадзе праца над амбіцыйнымі задачамі. У Віцебскай вобласці плануецца максімальна развіваць фармакалагічную індустрыю.

— У сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій працуем над тым, каб стварыць у Віцебску філіял Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Мы называем яго «віцебскай крэмніевай далінай», — паведаміў дэлегат.

На Віцебшчыне трэба прадоўжыць фарміраванне сацыяльна-культурнай прасторы, завяршыць рэканструкцыю і будаўніцтва музейнага комплексу, прысвечанага Юдалю Пэну, Казіміру Малевічу і Марку Шагалу — як адным з заснавальнікаў сучаснага сусветнага мастацтва.

— Гэта ў значнай ступені павялічыць экспарт паслуг, турыстычную прывабнасць Віцебшчыны, — упэўнены Уладзімір Цярэнцьеў.

Па словах выступоўцы, сур'ёзная ўвага ў працы органаў мясцовага кіравання і самакіравання надаецца сельскай мясцовасці. Спецыфіка Віцебскай вобласці ў тым, што на яе тэрыторыі больш за 6 тысяч вёсак.

— Нельга дапусціць, каб маленькія вёскі зніклі з карты нашай краіны, — лічыць дэлегат. — Абласны і раённыя Саветы дэпутатаў пільную ўвагу надаюць стану спраў у малых населеных пунктах, аказваюць людзям своечасовую дапамогу і падтрымку. Гэта зона нашай адказнасці. Мы думаем, што, магчыма, наспела неабходнасць прыняць новую праграму адраджэння вёскі. Ёсць шмат спосабаў захавання — гэта развіццё аграэкатурызму, фермерскай гаспадаркі, падтрымка з боку буйных аграгарадкоў. Гэтае пытанне патрабуе абмеркавання не толькі мясцовых органаў улады, але і на ўзроўні ўрада.

Прэзідэнт у адказ адзначыў, што не выключае: у будучыні ў сельскай мясцовасці могуць застацца толькі аграгарадкі. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы дадаў, што яму як чалавеку вясковаму не па душы такая перспектыва.

— Калі ў нас атрымаецца затармазіць працэс збірання ўсіх працоўных рэсурсаў у аграгарадкі, то мы яго будзем тармазіць праз развіццё былых цэнтраў далучаных гаспадарак, — заявіў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу звярнуць сур'ёзную ўвагу на развіццё такіх населеных пунктаў. Па яго словах, дзяржава не пакіне без увагі і так званыя неперспектыўныя вёскі, размяшчаючы у тым ліку на падтрымку бізнесменаў, многія з якіх родам з такіх невялікіх вёсак.

### Новыя радовішчы — новыя перспектывы

**Іван ГАЛАВАТЫ, генеральны дырэктар «Беларуськалія»**, паведаміў, што 85% тэхнікі, якая працуе на прадпрыемстве, беларускай вытворчасці. Таксама ён адзначыў, што яго прадпрыемства нават у складаныя гады змагло захаваць працоўныя месцы. Працягваецца жыллёвае будаўніцтва, у работнікаў прадпрыемства, асабліва шматдзетных, ёсць магчымасць атрымаць кватэры.

Прэзідэнт паведаміў, што новыя акцыянеры кампаніі «Уралкалій» рэгулярна звяртаюцца да яго наконт супрацоўніцтва з Беларуськаліем.

— Сёння яны гатовыя з намі аб'ядноўвацца. Мы не супраць. Але на нашых умовах. Умовы нармальныя для іх, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Ён звярнуў увагу, што пад Петрыкавам будзе створана прадпрыемства «Палессекалій». Гэта будзе магутны камбінат, абсталяваны па апошнім слове тэхнікі. Прадпрыемства «Слаўкалій» з'явіцца на Любанскім радовішчы.

— І мы станем поўнымі гаспадарамі на рынку калійных угнаенняў у сувязі з тымі аб'ёмамі, якія вырабляем, — лічыць Прэзідэнт.

### Абараніць слабых

**Марыяна ШЧОТКІНА, міністр працы і сацыяльнай абароны, старшыня Беларускага саюза жанчын**, у сваім дакладзе падкрэсліла: большасць насельніцтва краіны складаюць жанчыны.

— Сёння складана ўявіць грамадска-палітычнае жыццё без удзелу ў ім жанчын, — заўважыла Марыяна Шчоткіна. — Наша арганізацыя з'яўляецца сацыяльным мостам паміж органамі ўлады і насельніцтвам. Для нас няма закрытых тэм: мы бываем на прадпрыемствах прамысловасці і сельскай гаспадаркі, у школах, бальніцах, ВНУ, размаўляем з людзьмі, чуем іх меркаванні.

Асобнае месца ў сваім дакладзе міністр працы і сацыяльнай абароны ўдзяліла сем'ям, што выхоўваюць дзяцей-інвалідаў.

— Такія сем'і маюць патрэбу ў падтрымцы дзяржавы і грамадства, — сказала Марыяна Шчоткіна. — Мы патраніруем многія з іх і бачым, што больш чым трэцяя частка, на жаль, адносіцца да катэгорыі няпоўных. Таму прапануем узмацніць сацыяльную падтрымку такіх сем'яў, унесці змены ў закон аб дапамозе.

У прыватнасці, па словах Марыяны Шчоткінай, гаворка ідзе пра павелічэнне памеру дапамогі па доглядзе дзіцяці-інваліда да 18 гадоў з цяжкай ступенню страты здароўя, гэта значыць трэцяй і чацвёртай. Таксама прапануецца дазволіць бацькам, якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці-інваліда да 18 гадоў, акрамя атрымання дапамогі ў поўным аб'ёме, працаваць на ўмовах няпоўнай занятасці.

### Імпульс для развіцця

**Старшыня Астравецкага райвыканкама, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Адам КАВАЛЬКО**, выступаючы, падкрэсліў: будаўніцтва Беларускай атамнай электрастанцыі надасць магутны дадатковы імпульс развіццю Астравецкага раёна і краіны ў цэлым.

На рэалізацыю гэтага праекта працуюць сотні беларускіх прадпрыемстваў і арганізацый: будаўнікі, транспартнікі, праектныя інстытуты, установы сацыяльнай сферы. Толькі непасрэдна на будаўніцтве АЭС задзейнічана больш за 30 арганізацый, у тым ліку 22 беларускія — гэта больш за 5 тысяч працоўных месцаў. Паралельна з будынкам станцыі ствараецца жыллёвая і сацыяльная інфраструктура для будаўнікоў і спецыялістаў-атамшчыкаў. Па інфармацыі старшыні Астравецкага райвыканкама, у горадзе за апошнія 2-3 гады выраслі новыя жылыя мікраараёны з развітой інфраструктурай.

— У нас ніводзін будаўнік або спецыяліст не жыве ў вагончыку, а пражыванне арганізавана ў добраўпарадкаваных кватэрах, — заявіў Адам Кавалько.

Дэлегат назваў своечасовым даручэнне Прэзідэнта, выкладзенае ў Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу, аб стварэнні паблізу Беларускай АЭС кластара энергаёмістых інавацыйных вытворчасцяў. На яго думку, гэта дасць магчымасць больш эфектыўна выкарыстоўваць электраэнергію, якая вырабляецца на АЭС, стварыць дадатковыя працоўныя месцы, арганізаваць выпуск экспартна арыентаванай і імпартазамяшчальнай прадукцыі.

### Прыслухоўвацца сэрцам

**Архіепіскап Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскай епархіі Рымска-каталіцкай царквы**, нагадаў, што традыцыя народных сходаў бярэ пачатак са старазапаветных часоў.

— Дзяржаўным дзеячам, простым грамадзянам, рэлігійным лідарам трэба прыслухоўвацца да голасу народа сэрцам, каб рабіць усё магчымае для развіцця нашай радзімы, — сказаў Тадэвуш Кандрусевіч.

Ён нагадаў, што ў нядаўнім мінулым Прэзідэнт Беларусі сустракаўся з Папам Францішкам, а яшчэ раней — з Папам Бенядзіктам XVI.

— Усё гэта ставарае масты для ўзаемадзеяння ў розных сферах на карысць нашаму грамадству, — падкрэсліў іерарх.

**Вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, народны артыст Беларусі Віктар МАНАЕЎ**, у сваім выступленні адзначыў, што на працягу апошніх гадоў назіраецца зніжэнне колькасці наведвальнікаў у дзяржаўных тэатрах. Яны вымушаныя канкураваць з замежнымі антрэпрызамі невысокага мастацкага ўзроўню.

— Нават, як я ведаю, нашы вядомыя музычныя і харэаграфічныя калектывы, прызнаныя культурнымі сімваламі Беларусі, сутыкаюцца з цяжкасцямі ў арганізацыі канцэртаў у рэгіёнах, дзе мясцовыя кіраўнікі сцэнічных пляцовак аддаюць перавагу расійскім «зоркам», — паведаміў Віктар Манаеў.

Паводле яго слоў, беларускія выканаўцы часам адчуваюць сябе ўшчэмленымі на фестывалях, якія арганізуюцца пры дзяржаўнай або спонсарскай падтрымцы беларускіх прадпрыемстваў.

— Прапаганда і папулярызацыя свайго нацыянальнага мастацтва павінны стаць прыярытэтам у дзейнасці дзяржаўных арганізацый культуры. Нашай грамадскасці трэба выхоўваць у дзяцей і моладзі мастацкі густ, прывіваць любоў да роднай мовы, культуры, каб з іх атрымаліся сапраўдныя грамадзяне незалежнай Беларусі, — перакананы Віктар Манаеў.

Ён таксама звярнуў увагу на тое, што ў тым ліку дзякуючы спектаклям Купалаўскага тэатра жыхары многіх еўрапейскіх краін адкрылі для сябе новую краіну — незалежную Беларусь.

* * *

Пасля выступлення ўсіх дэлегатаў была прынята рэзалюцыя пятага Усебеларускага сходу і зварот удзельнікаў форуму да суайчыннікаў.




**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
**Фота БЕЛТА.**

# ГАЛОЎНЫЯ МЭТЫ ВЫЗНАЧАНЫ

**Марат ЖЫЛІНСКІ, рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, культуры і навуцы:**

— Тое, што ў гэтыя дні абмяркоўвалася на сходзе па тэме адукацыі — тэзісныя, рэпе́рныя пункты. Прамова Прэзідэнта і выступленні дэлегатаў фізічна не могуць цалкам раскрыць гэтую тэму. Але адна з галоўных задач дэлегатаў — пасля сходу ў калектывах расказаць, растлумачыць незразумелыя, неўдакладненыя моманты, у тым ліку і адукацыйныя.

Мяне асабліва зацікавілі тэмы адукацыі, кадравай палітыкі, эканомікі, унутранай палітыкі. І галоўны пасыл — тое, што Беларусь захавае сваю сацыяльную арыентаванасць. Прэзідэнт яшчэ раз пацвердзіў, што мы нікуды не пойдзем з гэтага шляху. Дзяржава шмат выдаткуе ў сацыяльную сферу і будзе працягваць рабіць гэта надалей.

Што тычыцца адукацыі і падрыхтоўкі школьных падручнікаў... Гэта складаны і шматгранны працэс. Тут трэба падыходзіць ад жыцця. Прэзідэнт падкрэсліў, што не акадэмікі павінны пісаць школьныя падручнікі, а людзі, якія непасрэдна працуюць у школе. Кожны павінен займацца сваёй справай. Токар — тачыць, слесар — слясарыць, цясляр — цяслярыць. А школьны настаўнік — вучыць па падручніках, напісаных па праграме, якая падрыхтавана з улікам патрэб і інтарэсаў школьнікаў і іх настаўнікаў. Выкладчыкі ВНУ таксама працуюць над праграмамі. Апошнім часам мы выдалі шэраг дапаможнікаў і па сваіх спецыяльнасцях (якіх, дарэчы, адкрылі амаль дзясятак новых). Насамрэч праграмы навучання пастаянна абнаўляюцца. За навучальны год у Акадэміі кіравання каля 800 з іх перагледжаюцца і актуалізуюцца.

**Алена БЕРАСНЕВА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце:**

— Радуе, што галоўная мэта развіцця дзяржавы на працягу наступнай пяцігодкі — павышэнне якасці жыцця насельніцтва. Вырашэнне эканамічных праблем таксама важнае, але гэта інструмент, які дасць магчымасць дзяржаве зрабіць узровень жыцця сваіх грамадзян больш якасным. У прыярытэце — павышэнне даходаў нашых людзей; зніжэнне, што вельмі істотна, ставак па крэдытах да 9–11%. Ці не самым важным з'яўляецца і тое, што праект праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця абяцае даць магчымасць кожнай сям'і пабудаваць свой дом або займець уласную кватэру.

Што да шляхоў дасягнення гэтых задач, то яны прапісаны дастаткова выразна. Па-першае, гэта гарантаваная магчымасць для кожнага — незалежна ад узросту, адукацыі, узроўню даходаў — адкрыць уласную справу. Наша краіна ўжо шмат зрабіла для паспяховага развіцця прыватнай ініцыятывы, а на працягу наступнай пяцігодкі зробіць яшчэ больш. Па-другое, у праекце Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступную пяцігодку пастаўлена задача знізіць інфляцыю да 5-працэнтнага ўзроўню. У выніку гэта гарантуе спыненне цэн, зробіць даступнымі крэдыты. Па-трэцяе, стане больш эфектыўнай інвестыцыйная палітыка. Так, ключавым паказчыкам эфектыўнасці работы міністраў і губернатараў стане менавіта аб'ём прыцягнутых інвестыцый.

**Алег РУМО, кіраўнік Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак, галоўны пазаштатны трансплантолаг Міністэрства аховы здароўя:**

— Сход — чарговая досыць эмацыянальная падзея, якая нам, беларусам, дазваляе сябе адчуць тымі самымі беларусамі, якія павінны перш за ўсё дбаць аб сваіх сем'ях, краіне і тым, што з намі будзе далей. З майго пункту гледжання, з таго, што прагучала ў прамовах Прэзідэнта і дэлегатаў, самае актуальнае: трэба абавязкова рабіць стаўку на моладзь, паскораным тэмпамі развіваць высокатэхналагічную сферу. І пэўны скачок мы зрабілі, наблізіўшыся да клуба эліты — 50-ці самых развітых краін свету. Каб гэта захаваць, трэба бегчы ў два разы хутчэй, чым мы беглі дагэтуль. Такі лейтматыў большасці меркаванняў, якія прагучалі. І гэта цалкам супадае з маім поглядам. Я перакананы, што тыя напрацоўкі, якія пакуль знаходзяцца на ўзроўні ідэй, выкрышталізуюцца ў канкрэтныя планы і стануць настаўленнем да будучых дзеянняў.

**Аляксандр МАШЭНСКІ, генеральны дырэктар «Санта-Брэмар»:**

— Калі чалавек вядзе бізнес, ён перш за ўсё імкнецца да пастаяннага паляпшэння. Калі казаць пра «Санта-Брэмар», для нас найбліжэйшая пяцігодка — гэта інвестыцыі не столькі ў металаабсталяванне, колькі ў развіццё патэнцыялу нашых супрацоўнікаў, новыя рынкі збыту, інавацыйныя падыходы да вядзення вытворчасці, што сугучна з выступленнямі на сходзе.

**Міхаіл ВІРКОЎСКІ, старшыня Парэцкага сельскага Савета Пінскага раёна:**

— З асаблівай увагай слухаў раздзел даклада, прысвечаны рэгіянальнаму развіццю. Цалкам згодзен з прыведзенай прыказкай, што не сена ідзе да каровы, а карова да сена. Калі гарадскія прадпрыемствы ў выніку аптымізацыі скарачаюць колькасць занятых, то працоўныя месцы трэба ствараць у глыбінцы.

Мы жывём у той частцы Палесся, якой асаблівую прыгажосць надае Ясельда. У нас маляўнічая прырода, хапае зямлі, ёсць усе ўмовы для жыцця. А вось прыватная ініцыятыва развіваецца пакуль марудна. Не так даўно адзін малады жыхар вёскі набыў будынак былой кацельні, адкрыў там станцыю тэхнічнага абслугоўвання аўтамабіляў. Другі арандуе кавалак зямлі і распачаў вырошчванне малін. Але гэта спроба бізнесу адзінochак. А трэба, каб людзі разварочваліся, развівалі сваю справу, наймалі іншых работнікаў, такім чынам вырашаліся б пытанні занятасці, падаткаў у бюджэт, сацыяльныя праблемы. Для гэтага, на маю думку, трэба вызначыць больш дзейсныя меры падтрымкі — асабліва сельскага прадпрымальніцтва. Пачынаючы сваю, хай самую маленькую справу, чалавек павінен адчуваць сябе больш упэўнена.

**Віктар ГЛУШЫН, першы сакратар Кастрычніцкага раённага камітэта БРСМ горада Віцебска:**

— Пачуў шмат цікавых, слушных, сугучных з маім поглядам меркаванняў. Нашу арганізацыю хвалюе перш за ўсё маладзёжная палітыка. Мы цалкам згодныя, што моладзь з'яўляецца адным з асноўных кірункаў развіцця і работы на бліжэйшую пяцігодку. Гэта будучае нашай краіны, якую сёння хвалюе працаўладкаванне, жыллё, сацыяльнае забеспячэнне і, вядома, магчымасць самарэалізавацца ў прафесіі, творчасці, культурнай сферы.

На сходзе асобнай тэмай гучала сітуацыя, якая склалася ў адукацыі. Згодны з думкай, што трэба больш пільна сачыць за тым, як напісаныя падручнікі. Да адукацыі варта падыходзіць больш акуратна, ашчадна, уважліва. Бо менавіта ў школьным узросце закладваецца тая база, на якой пасля фарміруецца грамадзянін. Для моладзі важна і тое, як надалей будзе адбывацца паступленне ў ВНУ. Усе гэтыя пытанні нас надзвычай хвалююць і мы спадзяёмся, што ў хуткім часе Міністэрства адукацыі кампетэнтна вырашыць іх.



Фота БЕЛТА.

**Мікалай УЛАХОВІЧ, старшыня Беларускай патрыятычнай партыі, вярхоўны атаман беларускага казацтва, кандыдат у Прэзідэнты - 2015:**

— Самы блізкі дыялог Прэзідэнта з народам — гэта Усебеларускі народны сход. Па шчырасці, хачу пачуць ад дэлегатаў іх ацэнку работы за апошні час, прапановы на будучыню, бо тут сабраліся прадстаўнікі розных слаёў насельніцтва, прафесій і спецыяльнасцяў. Мяркую, што кіраўнік дзяржавы выкажа сёння і новыя тэзісы. Спадзяюся, што ў бліжэйшы час актывізуецца партыйнае будаўніцтва ў плане развіцця палітычных партый у Беларусі. Я прадстаўляю патрыятычную партыю, якая, па вялікім рахунку, ахоплівае амаль усіх, бо мы не дзелім людзей па канфесійнай прыкмеце, гендарнай, па ўзроўні дастатку. Галоўнае — каб член нашай партыі быў патрыётам Беларусі.

**Мікалай КАЗЕКА, галоўны трэнер зборнай Беларусі па фрыстайле:**

— Мяне ў выступленні Прэзідэнта больш за ўсё зацікавіў пасыл, што не павінна быць ураўнілаўкі. У тым ліку ў аплаце работы тых людзей, якія выдатна працуюць, асабліва гэта тычыцца менеджараў, кіраўнікоў высокага ўзроўню. Яны сапраўды павінны адрознівацца і па становішчы ў грамадстве, і па зарплаце, і па матэрыяльным стане. Увогуле, добры ў прафесійным плане супрацоўнік павінен атрымліваць дастойную зарплату. Тады ў нас і якасць прадкуцыі, і якасць жыцця падымецца.

**Ірэна БУЙКА, пенсіянерка, Баранавіцкі раён:**

— Уважліва праслухала выступленне нашага Прэзідэнта на V Усебеларускім народным сходзе, асабліва наконт удасканалення пенсійнай сістэмы. Згодна з тым, што павышэнне пенсійнага ўзросту дае магчымасць не дапусціць зніжэння памеру пенсій і рэгулярнасці іх выплат.

Сапраўды, нас, старых, з кожным годам становіцца больш, а людзей працаздольнага ўзросту ўсё меней. Дзе ж браць грошы, каб своечасова забяспечыць пенсійныя выплаты? Разам з тым чалавек павінен думаць, як забяспечыць для сябе нябеднае жыццё ў пажылым узросце. Як адзін з варыянтаў — не толькі абавязковыя адлікі ў пенсійны фонд, але і накапляльныя.

Мне 66, працоўны стаж 40 гадоў, была ў калгасе даяркай, затым апаратарам на малаказаводзе. У мяне пенсія 2800 тысяч рублёў. Па вясковых мерках нядрэнная.

Годная старасць — гэта яшчэ і вынік таго, як мы выхавалі сваіх дзяцей. Мае сын і дачка жывуць і працуюць у горадзе. Пры першай магчымасці імкнуцца прыехаць, дапамагаюць прыбраць у хаце, на падворку, скасіць траву, падрамантаваць агароджу. Яны прывозяць мне і дарагія лекі. Да пенсіі ім яшчэ далёка. Спадзяюся, яна ў іх будзе забяспечаная.

**Надзея ЮШКЕВІЧ, Веранiка ПУСТАВІТ, Святлана ЯСКЕВІЧ, Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

■ Пра гэта сказана ў Праграме пяцігодкі

# ПАД ЗНАКАМ ЭЛЕКТРОННЫХ РАХУНКАЎ-ФАКТУР

**У Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады гаворыцца, што роля дзяржавы будзе заключацца ў стварэнні спрыяльных умоў для ініцыятывы і вядзення бізнесу як у дзяржаўным, так і ў прыватным сектары. Любы ініцыятыўны чалавек незалежна ад узроўню адукацыі або наяўнасці спецыяльных эканамічных ведаў зможа пачаць сваю справу ці знайсці працу, якая яму даспадобы. Дзяржава забяспечыць абарону і недатыкальнасць правоў прыватнай уласнасці, здыме абмежавальныя бар'еры, лібералізуе кантрольную дзейнасць.**

Актуальныя пытанні на гэтую тэму былі разгледжаны на пасяджэнні рабочай групы аб дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў пры грамадска-кансультацыйным савеце па развіцці прадпрымальніцтва пры Міністэрстве эканомікі.

Кажучы аб электронных рахунках-фактурах, прадстаўнікі Міністэрства па падатках і зборах паведамляюць, што абавязак фарміравання гэтага электроннага дакумента з 1 ліпеня ўзнікае для ўсіх суб'ектаў гаспадарання, якія з'яўляюцца плацельшчыкамі падатку на дабаўленую вартасць (ПДВ), у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, калі яны выплачваюць ПДВ пры рэалізацыі. Пры гэтым, тыя "іпэшнікі", якія імпартуюць тавары ў нашу краіну, выплачваюць адзіны падатак і "ўвазны" ПДВ, але не з'яўляюцца плацельшчыкамі ПДВ па рэалізацыі, то яны і не павінны фарміраваць электронны рахунак-фактуру пры ўвозе тавару.

## Інстытут падатковых кансультантаў

Кіраўнік спецыяльнага праекта ПРААН Таісія Еліцкі расказала аб перспектывах развіцця ў Беларусі інстытута падатковых кансультантаў. Як паказвае сусветная практыка, звычайна паслугі падатковага кансультанта вар'іруюцца ад растлумачэння падатковага заканадаўства да прадстаўлення інтарэсаў кампаніі або індывідуальнага прадпрымальніка ў падатковых, судовых і праваахоўных органах. У гэтым аспекце ёсць важны момант, калі за памылкі, якія былі дапушчаны ў ходзе выканання гэтых функцый, адказвае кансультант, а не падаткаплацельшчык. Для падрыхтоўкі такіх спецыялістаў плануецца ствараць самарэгулявальную арганізацыю — Палату падатковых кансультантаў, якая атрымае выключнае права надзяляць статусам падатковага кансультанта (па выніках экзамену) і пазбаўляць гэтага статусу (напрыклад, у выпадку парушэння этыкі).

На гэты момант у рамках праекта ПРААН, нацыянальным выканаўцам якога выступае Міністэрства па падатках і зборах, падрыхтаваны праект Указа Прэзідэнта Беларусі "Аб падатковым кансультаванні ў Рэспубліцы Беларусь". Удзельнікамі рабочай групы было адзначана, што на працягу працяглага часу гэты праект быў размешчаны на сайце МПЗ для публічных кансультацый.

Інстытут падатковых кансультантаў заклікаюць палепшыць умовы вядзення бізнесу і прыйсці на дапамогу прадпрымальнікам. У выпадку прыняцця Указа пачнецца пераходны перыяд працягласцю ў 5 гадоў, падчас якога для аўтсорсінгавых кампаній захаваецца магчымасць аказваць кансультацыйныя паслугі ў сферы падатковага заканадаўства і пры гэтым не мець у сваім штаце сертыфікаванага падатковага кансультанта. Праз пяць гадоў у кампаніі, якая аказвае такія паслугі, як мінімум адзін падобны кансультант у штаце будзе неабходны.

Выкарыстанне паслуг падатковых кансультантаў, натуральна, будзе добраахвотным як падчас, так і пасля гэтага пераходнага перыяду. Разам з тым захаваецца магчымасць суб'ектам гаспадарання напрамую ўзаемадзейнічаць з падатковай інспекцыяй, без паслуг падатковых кансультантаў.

## Шэсць месяцаў без праверак

Першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Валянцін Татарыцкі праінфармаваў рабочую групу аб тым, што праект нарматыўнага прававога акта, які ўносіць змяненні ў КоАП у частцы змяншэння адміністрацыйнай адказнасці за невыкананне тэхрэгламентаў, на гэты момант рыхтуецца да другога чытання ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Да моманту ўнясення змяненняў у КоАП дзейнічаюць існуючыя памеры штрафных санкцый.

Валянцін Татарыцкі нагадаў, што на працягу першага паўгоддзя планавых праверак па пытаннях выканання тэхрэгламенту не вялося. У той жа час у выніку маніторынгаў Дзяржстандарт сфармаваў статыстыку па назвах прадукцыі, якая выклікае найбольшыя асцярогі, адносна яе якасці.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

Звязда. Наперад у мінулае. Беларусь 3. Сумесны праект «Звязды» і «Беларусь 3»

# СПЯВАЛІ Ў ЯЧАВЕ, ЗАХАПЛЯЛІСЯ — У КАЗЛОВІЧАХ

## Сноп на шчасце і лялька як выканальніца жаданняў

**Лета — самы зручны час для вандровак. Ярка свеціць сонца, усё навокал квітнее. Таму і мы з камандай праекта «Наперад у мінулае» тэлеканала «Беларусь 3» былі рады пакінуць тлумную сталіцу і выправіцца ў падарожжа па краіне. Гэтым разам кіруемся ў вёску Казловічы, што на Случчыне, дзе нас чакае знаёмства з народным фальклорным гуртам «Ячаўскія вячоркі». Таксама завітаем у Слуцкі Цэнтр традыцыйнай культуры — яго супрацоўнікі аднаўляюць старажытныя тэхналогіі вырабу лялек і адраджаюць мастацтва маляванак. Тэлепраграму можна будзе пабачыць у ліпені, але ўжо сёння чытачы «Звязды» маюць магчымасць даведацца пра яе змест.**


Гурт «Ячаўскія вячоркі».

### Запрашаем на вячоркі

Гурт «Ячаўскія вячоркі» ў Казловічах — сапраўдныя зоркі. Без іх звонкіх спеваў не абыходзіцца ніводнае мясцовае свята, ды і гісторыя калектыву ўражвае: ён існуе ўжо 37 гадоў!

Кіраўнік і стваральніца «Ячаўскіх вячорак» Людміла Калядка расказала:

— Калектыў быў створаны ў 1979 годзе тут, у Казловічах, а потым некаторыя нашы ўдзельніцы пераехалі ў суседняе Ячава, таму вырашылі змяніць месца размяшчэння гурта, знайсці новых спявачак. Калі прыехала ў Ячава, абышла ўсю вёску, зазірнула ў 18 хат — і ўсе гаспадыні пагадзіліся спяваць у гурце.

Мясцовыя прыгадваюць: жанчыны ў Ячаве спявалі так прыгожа і так гучна, што іх песні чуваць было нават у Казловічах. Для большага ўражання дадам, што адлегласць паміж вёскамі — 4 кіламетры! Потым, калі ў Казловічах пабудавалі новы вялікі Дом культуры і вылучылі для «Ячаўскіх вячорак» асобнае рэпетыцыйнае памяшканне, калектыў зноў пераехаў. Але назва засталася ранейшай.

У 1992 годзе ансамбль атрымаў званне народнага. Спачатку ў ім спявалі толькі жанчыны, потым да іх далучыліся і мужчыны — мясцовыя музыканты.

— Можна сказаць, што мы ўвесь час выступаем у адным складзе. Толькі старэйшыя адышлі. За гэты час мы выдатна «спеліся», — кажа Людміла Кузьмінічна, — Разам аб'ехалі ўвесь белы свет! Выступалі на Днях культуры Беларусі ва Узбекістане, у Маскве, на фестывалях у Істры, Ліпецку, сталі лаўрэатамі многіх абласных, рэгіянальных, рэспубліканскіх і міжнародных фестываляў. І адусюль прывозім карысныя падарункі, якімі карыстаемся ў рабоце.

### Слухачы патрабуюць!..

Раней на сцэне «Ячаўскія вячоркі» прадстаўлялі не толькі песні і танцы, але ладзілі паўнавартасныя абрады. Але сёння ў іх рэпертуары назбіралася вельмі шмат песень, ды і слухачы патрабуюць вясёлай атмасферы, выбухаў-прыпевак, таму падчас канцэртаў гурт больш не прадстаўляе абрадавы складнік. Тым не менш калектыў — сталы ўдзельнік мясцовых свят, а своеасаблівы яго хіт — абрад Зажынкі. У першы дзень жніва ў мясцовай гаспадарцы жанчыны-спявачкі ўсе разам ідуць у поле, зжынаюць некалькі сімвалічных снапоў, спяваюць песні. Пасля афіцыйнай часткі кіруюцца ў вёску, заходзяць да тых вяскоўцаў, хто не так даўно пабудаваў новы дом, ажаніўся, а таксама ў сем'і, дзе нарадзіліся дзеці. Сноп у падарунак ад калектыву — як матэрыяльнае ўвасабленне пажаданняў шчасця, здароўя і дабрабыту новай маладой сям'і і маленькаму жыхару Казловічаў. Людміла Калядка кажа, што візіт «Ячаўскіх вячорак» — вялікае свята для кожнай сям'і, іх прывітанняў штогод чакаюць, а калі раптам нейкую хату жанчыны выпадкова абмінуць, — вяскоўцы вельмі крыўдуюць.

У рэпертуары «Ячаўскіх вячорак» — як і досыць вядомыя народныя песні, танцы, так і тыя, што спяваліся менавіта ў гэтай мясцовасці, якія помняцца жанчынам яшчэ ад матуль і бабуль. Самы старажытны пласт — спевы, што суправаджаюць абрады, напрыклад, вяселле.

Спявачкі добра памятаюць песні, што павінны гучаць у пэўныя моманты вяселля. Вось такім спевам віталі зяця, які падыходзіў са світай да дома маладой:

*Выхадзіла маці ды зяця*
*страчаць,*
*Ды не так страчаць —*
*як выглядаць,*
*Ці не вельмі п'яны,*
*як Панасаў брат,*
*Ці не жаль дзіцяці*
*за яго аддаць.*
*Каўнер багровы —*
*зяць чарнаброў,*
*Каўнер ваўністы —*
*зяць ганарыст.*

А гэтая песня-прыпеўка прызначаецца для прадстаўлення маладой:

*Да на небе сонейка*
*калясом ідзе роўненька,*
*Брат сястрыцу на пасад*
*вядзе раненька.*

А гэтая сумная песня — зварот маладой, развітанне з жыццём «у дзеўках», з сяброўкамі:

*Ты касіца мая русая,*
*Я табою любавалася*
*Ды нічога не баялась...*

| 19 | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации-банку | | | 304 574 | 199 387 |
| 20 | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | | (15 965) | (9 245) |

Временно и.о. Председателя Правления С.И. Шишов

Главный бухгалтер В.В. Манцивода

Финансовая отчетность банка в полном объеме размещена на сайте банка по адресу: http://www.priorbank.by/

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 06.05.2013 года. УНП 100220190.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| Продавец | **ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», г. Минск, ул. Некрасова, 9** |
| Вид аукциона | **Аукцион по комбинированной схеме (сначала на понижение, затем на повышение цены недвижимого имущества)** |

**Предмет аукциона**

| Лот № | Наименование, общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| 1 | **Гараж № 226,** 16,1 кв.м | 500/D-14030 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 4В, пом. 226 |
| 2 | **Гараж № 267,** 16,1 кв.м | 500/D-14067 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 4В, пом. 267 |
| 3 | **Гараж № 278,** 15,8 кв.м | 500/D-14075 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 4В, пом. 278 |
| 4 | **Гараж № 351,** 15,9 кв.м | 500/D-14128 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 4В, пом. 351 |
| 5 | **Гараж № 423,** 15,3 кв.м | 500/D-14180 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 4В, пом. 423 |
| 6 | **Гараж № 26,** 16,4 кв.м. | 500/D-13953 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 4В, пом. 26 |
| **Начальная цена с НДС 20% каждого Лота – 151 500 000 белорусских рублей (15 150 руб. 0 коп.)** | | | **Шаг понижения цены: 7 575 000 белорусских рублей (757 руб. 50 коп.)** |
| **Минимальная цена с НДС 20% каждого Лота – 106 050 000 белорусских рублей (10 605 руб. 0 коп.)** | | | **Шаг повышения цены: 7 575 000 белорусских рублей (757 руб. 50 коп.)** |
| 7 | **Гаражи на 4 автомашины,** 89,3 кв.м | 102/С-9461 | Брестская обл., Каменецкий р-н, г. Высокое, ул. Советская, д. 114 |
| **Начальная цена с НДС 20% – 167 000 000 белорусских рублей (16 700 руб. 0 коп.)** | | | **Шаг понижения цены: 8 350 000 белорусских рублей (835 руб. 0 коп.)** |
| **Минимальная цена – 116 900 000 белорусских рублей (11 690 руб. 0 коп.)** | | | **Шаг повышения цены: 8 350 000 белорусских рублей (835 руб. 0 коп.)** |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона (лота) в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **30** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предмет аукциона может быть снят с аукциона организатором в любое время до объявления его проданным

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 14.05.2016 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **05.07.2016 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **04.07.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +37517-280-36-37; +375 29-183-69-71. auction@cpo.by; www.cpo.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О СНЯТИИ ОБЪЕКТА С ТОРГОВ

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), сообщает о снятии с аукциона по продаже земельных участков в частную собственность, назначенного на **15.07.2016, лота № 14** (земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома площадью 0,1180 га, кадастровый номер земельного участка 623685205601000549, расположенного по адресу: Острошицко-Городокский с/с, д. Околица, участок № 2). *Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 15.06.2016 г.*

УНН 690324015

Утерянный представительством Белгосстраха по Партизанскому району г. Минска бланк страхового полиса по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВА № 7851976 **считать недействительным.**

УНП 100122726

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 4** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. № 400/С-95222 (назначение – здание специализированное розничной торговли, назначение – магазин), общей площадью 85,2 кв.м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Коптевский с/с, д. Коробчицы, ул. Мира, 40 А |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый № 422084506801000096, площадью 0,0841 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли (для эксплуатации и обслуживания магазина)), расположенном по адресу: Гродненский р-н, Коптевский с/с, д. Коробчицы, ул. Мира, 40 А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в охранной зоне линий электропередачи, код – 6, площадью 0,0086 га; земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водных объектов вне прибрежных полос, код – 2, площадью 0,0841 га |
| **Начальная цена продажи** | 460 106 880 (четыреста шестьдесят миллионов сто шесть тысяч восемьсот восемьдесят) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 46 010 688 (сорок шесть миллионов десять тысяч шестьсот восемьдесят восемь) белорусских рублей |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Продавец** | Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 06 июля 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первых торгов было размещено в газете «Звязда» от 01.10.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 01 июля 2016 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/**

Дэпартамент
па каштоўных паперах
Міністэрства фінансаў
Рэспублікі Беларусь
ЗАВЕРАНА
С.А. Сушко
20.06.2016 г.

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## ОБ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ВОСЕМЬДЕСЯТ СЕДЬМОГО ВЫПУСКА СОВМЕСТНОГО ОБЩЕСТВА С ОГРАНИЧЕННОЙ ОТВЕТСТВЕННОСТЬЮ «ТАМБАЗ» СООО «ТАМБАЗ» (СУМЕСНАГА ТАВАРЫСТВА З АБМЕЖАВАНАЙ АДКАЗНАСЦЮ «ТАМБАЗ» СТАА «ТАМБАЗ»)

1. Полное наименование эмитента:

на русском языке – совместное общество с ограниченной ответственностью «ТАМБАЗ»; на белорусском языке – сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «ТАМБАЗ».

Сокращенное наименование эмитента:

на русском языке – СООО «ТАМБАЗ»;

на белорусском языке – СТАА «ТАМБАЗ».

2. Решением Минского горисполкома № 42 от 13 января 2005 года Эмитент был зарегистрирован в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100348810.

3. Место нахождения Эмитента:

Республика Беларусь, 220073, г. Минск, пр. Пушкина, 68, комн. 33. Тел.: 8 (017) 220 77 80. E-mail: tambaz@yandex.ru

4. Общество вправе осуществлять любые виды деятельности, предусмотренные Общегосударственным классификатором Республики Беларусь «Виды экономической деятельности» ОКРБ 005-2011, в том числе: организация и обеспечение строительства жилых домов, выполнение функций заказчика-застройщика с обеспечением технического надзора за ходом строительства, сдача в аренду машин, оборудования.

5. Размер уставного фонда Эмитента составляет 24 998 098 046 белорусских рублей.

6. Общий объем 87 выпуска жилищных облигаций Эмитента составляет 18 150 000 000 (восемнадцать миллиардов сто пятьдесят миллионов) белорусских рублей. Количество эмитируемых облигаций составляет 2750 (две тысячи семьсот пятьдесят) штук. Номинальная стоимость облигации 87 выпуска составляет 6 600 000 (шесть миллионов шестьсот тысяч) белорусских рублей и имеет эквивалент равный одному метру квадратному общей площади в квартире в строящемся жилом доме №8 (по генплану) объекта «Многоэтажные жилые дома (не относящиеся к жилым домам повышенной комфортности) со встроенно-пристроенными административными и торговыми помещениями и подземной двухуровневой автостоянкой в квартале ул. М. Богдановича – ул. Корш-Саблина – ул. Тургенева – пер. Верхний». Вторая очередь строительства. Третий пусковой комплекс в г. Минске без учета стоимости отделочных работ. Дата начала погашения – 31 декабря 2017 года.

7. Размещение облигаций осуществляется на неорганизованном рынке путем открытой продажи облигаций в срок – с 23 июня 2016 года до 31 декабря 2017 года.

Жилищные облигации имеют право приобретать (как в процессе размещения жилищных облигаций, так и в процессе их обращения) юридические и физические лица, заключившие с Эмитентом соглашение в простой письменной форме, предусматривающее обязательства Эмитента по строительству жилых помещений владельцам жилищных облигаций.

8. Срок обращения облигаций: с 23 июня 2016 года по 31 декабря 2017 года, 556 календарных дней.

9. Исполнение обязательств по облигациям 87 выпуска обеспечивается поручительством юридического лица согласно договору поручительства № б/н от «02» мая 2016 г., заключенного с Обществом с ограниченной ответственностью «Интерфакт», который действует по 31 марта 2018 года. Сумма поручительства, в пределах которой поручитель отвечает перед владельцами облигаций, исполнение обязательств по которым обеспечивается поручительством, в случае неисполнения или ненадлежащего исполнения эмитентом обязательств по облигациям, составляет: 18 150 000 000 (восемнадцать миллиардов сто пятьдесят миллионов) белорусских рублей.

10. Номера счетов Эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций:

- текущий счет № 3012087855016 в ОАО «Белорусский Народный Банк» г. Минска, код 765;

- текущий счет № 3012621670017 в ЗАО «Трастбанк» г. Минска, код 288;

- текущий счет № 3012144770011 в ОАО «Технобанк» г. Минска, код 182.

11. Порядок раскрытия Эмитентом информации.

Эмитент размещает на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг, а также публикует в печатных средствах массовой информации («Экономическая газета» и (или) «Звязда»), и (или) размещает на официальном сайте эмитента в глобальной компьютерной сети Интернет, сведения в следующие сроки:

- срок публикации годовой бухгалтерской отчетности: ежегодно не позднее «30» апреля;

- срок публикации информации о совершении эмитентом крупной сделки, признаваемой таковой в соответствии с частью первой статьи 58 Закона Республики Беларусь от 9 декабря 1992 года «О хозяйственных обществах»: не позднее двух месяцев с даты совершения крупной сделки;

- срок публикации информации о совершении эмитентом сделки, в отношении которой имеется заинтересованность его аффилированных лиц, признаваемой таковой в соответствии с частью первой статьи 57 Закона Республики Беларусь «О хозяйственных обществах»: не позднее двух месяцев с даты совершения сделки, в отношении которой имеется заинтересованность его аффилированных лиц;

- срок публикации информации о проведение эмиссии эмиссионных ценных бумаг, приостановление, возобновление, запрет эмиссии, признание эмиссии несостоявшейся, аннулирование выпуска (части выпуска) эмиссионных ценных бумаг: не позднее семи календарных дней после принятия соответствующего решения республиканским органом государственного управления, осуществляющего государственное регулирование рынка ценных бумаг;

- срок публикации информации о внесенных изменениях в Проспект эмиссии: не позднее семи календарных дней после регистрации изменений в регистрирующем органе;

- срок публикации информации о принятом решении о реорганизации Эмитента, его дочерних и зависимых обществ: не позднее пяти рабочих дней после принятия соответствующего решения;

- срок публикации информации о возбуждении в отношении Эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве): в течение пяти дней с момента получения соответствующего судебного постановления;

- информация о принятом решении о ликвидации (прекращении деятельности) Эмитента, его дочерних и зависимых обществ публикуется в приложении к журналу «Юстиция Беларуси» в срок не позднее пяти рабочих дней после принятия соответствующего решения.

12. Депозитарное обслуживание жилищных облигаций Эмитента осуществляет депозитарий Эмитента – Республиканское унитарное предприятие «Республиканский центральный депозитарий ценных бумаг».

Юридический адрес депозитария Эмитента: 220004, г. Минск, ул. Мельникайте 2, 4-й этаж; Почтовый адрес депозитария Эмитента: 220004, г. Минск, ул. Мельникайте 2, 4-й этаж;

Дата и регистрационный номер депозитария Эмитента как юридического лица, наименование регистрирующего органа: Мингорисполком, № 100967318 от 06 марта 2003 года.

Номер лицензии Министерства финансов Республики Беларусь № 02200/5200-4-1111 от 16 мая 2012 г., срок действия лицензии – до 29 июля 2022 года.

13. С более подробной информацией и Проспектом эмиссии жилищных облигаций можно ознакомиться в течение срока размещения Облигаций: ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 10.00 до 16.00 по адресу: Республика Беларусь, 220040, г. Минск, ул. Тургенева, д. 5, пом. 72. Ознакамливающееся лицо имеет право читать и делать выписки из предоставляемых в соответствии с настоящим пунктом документов.

■ Навіны рэгіёнаў

# АЎТАПАРК ПАДАРЫЎ АЎТОБУС ЦАРКОЎНАМУ ПРЫХОДУ

**Пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведамілі ў Пінскім райвыканкаме**

**Нядаўна прыход храма ў гонар Нараджэння Святой Багародзіцы, што знаходзіцца ў вёсцы Парэчча Пінскага раёна, атрымаў новы аўтобус. Спонсарам выступіў Пінскі аўтобусны парк.**


pinsknews.by

— Аўтобус нам патрэбен, каб падвозіць людзей на царкоўныя службы: у прыход уваходзіць 12 вёсак, — патлумачыў «Звяздзе» **протаіерэй Канстанцін ЛІТВІНЧУК, настаяцель храма**. — Некаторыя ад Парэчча знаходзяцца за 8-10 кіламетраў, і людзям складана дабірацца самастойна.

Айцец Канстанцін згадаў, што раней прыхаджане ездзілі на царкоўную службу рэйсавым аўтобусам. Праўда, назад вяртацца трэба было самастойна, а для многіх вернікаў гэта вельмі складана з-за ўзросту. Аўтобус, які цяпер ёсць у прыходзе, дапамагае вырашыць гэту праблему.

**Генадзь ПАЛІКОЎСКІ, намеснік дырэктара па перавозках і ідэалагічнай рабоце Пінскага аўтобуснага парка**, паведаміў, што гэта ўжо другі аўтобус, які перадае яго арганізацыя прыходу.

— Калісьці мы перадавалі прыходу адзін аўтобус, — сказаў ён. — А цяпер у нашым аўтапарку адбылося чарговае абнаўленне аўтобуснага складу — і мы прапанавалі прыходу замяніць стары аўтобус на больш новы.

**Надзея ЮШКЕВІЧ,** *г. Пінск.*

■ Блізкая ўлада

# ВЫРАШЫЦЬ ПРАБЛЕМНЫЯ ПЫТАННІ

**25 чэрвеня з 9 да 12 гадзін у абласных цэнтрах і сталіцы адбудуцца «прамыя лініі» з удзелам кіраўніцтва рэгіёнаў. У гэты час задаць свае пытанні і вырашыць надзённыя праблемы можна, звярнуўшыся па наступных тэлефонах:**

Мікалай Васілевіч ТОКАР — першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама — 80162213121.

Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС — намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама — 8021 222 22 22.

Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ — намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама — 8023 275 12 37.

Ігар Андрэевіч ПАПОЎ — кіраўнік спраў Гродзенскага аблвыканкама — 8015 273 56 44.

Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН — кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама — 8022 250 18 69.

Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ — кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама — 8017 500 41 60.

Васіль Васілевіч ПАНАСЮК — старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў — 8017 222 44 44.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## З ГРОДНА — У БАЛГАРЫЮ І НА БАЛТЫКУ

**Першыя ў сёлетнім летнім сезоне самалёты накіраваліся з Гродзенскага аэрапорта ў балгарскі горад Бургас і ў Калінінград.**

Чартарныя рэйсы ў курортны Бургас летась былі добра запатрабаваны жыхарамі Гродзеншчыны, і цяпер Boeing 737-300, разлічаны на 148 месцаў, зноў быў загружаны «пад завязку». Скарыстацца гэтай магчымасцю (палёт доўжыцца 1 гадзіну 50 хвілін) можна да канца жніўня. У перспектыве магчымы чартарныя рэйсы з горада над Нёманам і ў іншыя курортныя краіны.

Што тычыцца балтыйскага кірунку, то рэйсы з Гродна ў Калінінград плануюцца да 2 верасня, двойчы на тыдзень — у аўторак і пятніцу.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## РАДЗІМА Ў ФАРБАХ

**У Магілёве падвялі вынікі 21-га міжнароднага пленэра па жывапісе «Вобраз Радзімы ў выяўленчым мастацтве».**

Пленэру па традыцыі папярэднічае творчая паездка беларускіх мастакоў у сядзібу вядомага мастака Васіля Паленава, што ў Тульскай вобласці, дзе знаходзіцца прысвечаны яму мемарыяльны гісторыка-мастацкі і прыродны музей-запаведнік. Амаль тыдзень яны натхняюцца навакольнымі краявідамі і ствараюць карціны. Потым вяртаюцца ў Магілёўскую вобласць, дзе да іх далучаюцца калегі з іншых краін. Сёлета пленэр сабраў 18 мастакоў з Беларусі, Расіі, Арменіі, Кітая, Ізраіля, Сербіі, Эстоніі. Некалькі дзён яны працавалі ў Слаўгарадскім раёне, паколькі 21-ы па ліку пленэр быў прысвечаны мастаку XIX стагоддзя Фёдару Тулаву, майстру партрэта.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## СТУДЭНТКІ ЗАТРЫМАЛІ РАБАЎНІКА

**Навучэнкі першага курса Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа чыгуначнага транспарту затрымалі мужчыну, які на вуліцы Бабруйскай у сталіцы збіваў пенсіянера.**

Паводле інфармацыі Кастрычніцкага РУУС г. Мінска, тры дзяўчыны ўбачылі, што на пенсіянера напаў малады чалавек і, не разгубіўшыся, затрымалі яго. Нападаўшым аказаўся 27-гадовы ўраджэнец Бабруйска, які ў гэты момант быў у стане алкагольнага ап'янення. Пры затрыманні хлопец пашкодзіў планшэт адной з навучэнак. Праз некалькі хвілін на месца здарэння прыбылі міліцыянеры чацвёртай роты патрульна-пастаўной службы ГУУС Мінгарвыканкама. Падчас разбору было ўстаноўлена, што затрыманы паспеў не толькі нанесці пенсіянеру цялесныя пашкоджанні, але і забраць у таго 200 тысяч рублёў. Грошы зламыснік схаваў у шкарпэтку. Вінаватаму пагражае крымінальная адказнасць за грабеж і пашкоджанне маёмасці асобы, якая выконвала грамадзянскі доўг па спыненні правапарушэння. Кіраўніцтва Кастрычніцкага РУУС падзякавала дзяўчатам за неабыякавасць да людской бяды.

## МАХЛЯРА Ў ВЫШУКУ «ЎЗЯЛІ» НА ЭКЗАМЕНЕ

**Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Партызанскага РУУС сталіцы затрымалі 25-гадовага маладога чалавека, які чатыры гады знаходзіўся ў вышуку па падазрэнні ў здзяйсненні махлярства.**

— Увесь гэты час грамадзянін скрываўся ў Расійскай Федэрацыі. А затрымалі яго ў Оршы, адкуль ён родам. Малады чалавек прыйшоў у ДАІ для здачы экзамену па ваджэнні, дзе і быў затрыманы, — расказала прэс-афіцэр Партызанскага РУУС г. Мінска Наталля Ганусевіч. — Пачынаючы з 2012 года грамадзянін уваходзіў у давер да малазнаёмых людзей, з якімі знаёміўся праз інтэрнэт, браў у іх грошы на набыццё бытавой тэхнікі і знікаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Надвор'е

# ХАЦЕЛІ ЛЕТА? АТРЫМАЙЦЕ!

**У найбліжэйшыя дні — спёка і без дажджоў**

**Беларусаў чакае сапраўдная летняя спякота, паведамляе БЕЛТА са спасылкай на галоўнага сіноптыка Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Святлану РЫБАКОВУ.**

«А дзякуючы антыцыклальнаму характару ўмоў надвор'я разлічваць на дажджы не выпадае», — адзначыла спецыяліст. Сёння ападкаў не чакаецца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 12 да 18 градусаў, днём — 26-32 градусы цяпла, месцамі па Віцебскай і Магілёўскай абласцях — на пару градусаў ніжэй. «Да канца тыдня пераважны ўплыў на надвор'е ў Беларусі будзе аказваць антыцыклон, сфарміраваны цёплай паветранай масай» — расказала Святлана Рыбакова. У суботу чакаецца сухое надвор'е. Тэмпература паветра ў начны час не апусціцца ніжэй 13-20 градусаў цяпла, днём будзе да плюс 32, па паўднёвым захадзе паветра прагрэецца да плюс 34. У нядзелю захаваецца спякотнае надвор'е. На большай частцы тэрыторыі краіны будзе без ападкаў, толькі днём месцамі па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях, дзе адаб'ецца ўплыў атмасфернага фронту, які змяшчаецца з Заходняй Еўропы, пройдуць кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Начная тэмпература будзе знаходзіцца ў межах 16-22 градусаў цяпла, днём будзе ад 27 да 32 градусаў са знакам плюс, па поўдні паветра прагрэецца да 34. Па словах Святланы Рыбаковай, у пачатку наступнага тыдня атмасферныя франты абумовяць няўстойлівае надвор'е. У панядзелак ноччу месцамі, днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя навальнічныя дажджы, месцамі навальніцы будуць суправаджацца парывістым ветрам. Тэмпература паветра ўначы — 17-22 градусы цяпла. Дзённая тэмпература будзе трымацца ў межах ад 25 да 32 градусаў са знакам плюс, па паўднёвым усходзе — на пару градусаў вышэйшая. У аўторак месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, навальніцы, пры навальніцах парывісты вецер. Тэмпература ўначы складзе ад 13 да 20 цяпла, удзень — 21-28 градусаў вышэй за нуль, па поўдні Беларусі — на 2-4 градусы вышэй. Да сярэдзіны тыдня спякота спадзе. У сераду тэмпература паветра ўначы складзе 13-20 градусаў цяпла. Дзённая тэмпература чакаецца ў межах ад 21 да 28 вышэй за нуль. Месцамі не абыдзецца без кароткачасовых навальнічных дажджоў.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**


Фота Івана КУПАРВАСА.

■ Сітуацыя

# ЦІ БУДЗЕМ СЁЛЕТА З ГРЫБАМІ І ЯГАДАМІ?

**Навукоўцы прадставілі вынікі даследавання на гэтую тэму**

**Прагнозныя паказчыкі (балы) плоданашэння ягадных раслін і ядомых грыбоў падрыхтаваны па выніках маніторынгу Нацыянальнай акадэміі навук у лясным фондзе Беларусі ў красавіку–чэрвені бягучага года на 10 пастаянных пунктах назірання і 61 часовай пробнай плошчы.**

Паводле даследаванняў, у Віцебскай вобласці прагназуецца ўраджай чарніц, вышэйшы за сярэдні (4 балы), у астатніх рэгіёнах чакаецца сярэдняя ўраджайнасць ягадніка – 3 балы.

Нават пры спрыяльным летнім надвор'і ўраджай брусніц у Віцебскай і Мінскай абласцях абяцае быць сярэднім (3 балы), у Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай, Магілёўскай — трохі ніжэй за сярэдні — 2 балы.

Прадукцыйнасць буякоў у Віцебскай і Гомельскай абласцях чакаецца сярэдняй (3 балы), у астатніх рэгіёнах Беларусі — ніжэйшай за сярэднюю (2 балы). Ніжэйшай за сярэднюю (2 балы) чакаецца і ўраджайнасць журавін у Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях. А вось у Віцебскай вобласці ўраджай гэтага віду прагназуецца вышэйшым за сярэдні (4 балы).

Надвор'е ў красавіку-маі адбілася на цвіценні ягаднікаў, у першую чаргу чарніц. З-за няўстойлівага і халоднага надвор'я ў першай дэкадзе чэрвеня на ўсёй тэрыторыі Беларусі адбыўся больш інтэнсіўны, чым меркавалася, адпад бутонаў, кветак і завязяў.

У сувязі з павышаным тэмпературным фонам і ўзрастаннем вільготнасці глебы ў сярэдзіне красавіка—першай палове мая ва ўсіх рэгіёнах Беларусі адзначаны страчкі і смаржкі, а на поўдні зафіксавана першая хваля белых грыбоў, падбярозавікаў і чырвонагаловікаў. У Брэсцкай, Гомельскай і Гродзенскай абласцях з'явіліся масляты і лісічкі. Аднак рост пладовых цел ядомых грыбоў месцамі быў кароткачасовым з-за дэфіцыту вільгаці ў глебе (дажджы ішлі лакальна) і значнага пахаладання ў канцы мая—пачатку чэрвеня. У першай палове чэрвеня ў лясах практычна па ўсёй тэрыторыі поўдня краіны адзначаны лісічкі.

Прагнозныя паказчыкі па тым, колькі вырасце ядомых грыбоў (на падставе сярэдніх шматгадовых даных і метэаралагічных умоў мінулага і бягучага года, якія аказваюць уплыў на фарміраванне ўраджаю грыбоў у 2016 годзе), наступныя. Паводле вынікаў маніторынгу, ураджай баравікоў, чырвонагаловікаў, падбярозавікаў і лісічак па ўсіх абследаваных абласцях, акрамя Віцебскай, чакаецца ніжэйшым за сярэдні (2 балы), апенек асенніх — сярэдні (3 балы). Пры дастатковай колькасці ападкаў у летнія месяцы (ліпень-жнівень), а таксама ў верасні, плоданашэнне ўсіх відаў ядомых грыбоў па асобных тэрыторыях ляснога фонду Беларусі можа аказацца больш высокім.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па аграрнай палітыцы Разганаву Аляксандру Іванавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

## РАНАЛДУ НЕРВУЕЦЦА, АЛЕ ЗАБІВАЕ

У сераду завяршыліся апошнія матчы чэмпіянату Еўропы ў групах, якія вызначылі канчатковы склад удзельнікаў 1/8 фіналу.



Зборная Партугаліі згуляла з камандай Венгрыі вельмі баявую нічыю і самы пакуль выніковы матч на Еўра-2016 — 3:3. Раналду, які ў матчы з Аўстрыяй не забіў пенальці, на гэты раз адзначыўся галявым дублем, прычым партугальцы кожны раз адыгрываліся. Дзякуючы гэтым галам 31-гадовы форвард мадрыдскага «Рэала» стаў першым футбалістам у гісторыі, які вызначыўся на чатырох чэмпіянатах Еўропы (у 2004, 2008, 2012 і 2016 гадах); яго каманда, нягледзячы на тое, што не атрымала ніводнай перамогі, а згуляла тры нічыі, тым не менш трапіла ў плэй-оф.

Але напярэдадні найлепшы гулец свету «вызначыўся» зусім па-іншаму. У аўторак, падчас прагулкі партугальскай зборнай у трэніровачнай базе ў Францыі карэспандэнт партугальскага выдання Correio da Manha спытаў у форварда, ці гатовы ён да матча з Венгрыяй. Замест адказу Раналду выхапіў у журналіста мікрафон і выкінуў у возера. Як вядома, у нападаючага зборнай дрэнныя адносіны з Correio da Manha: на старонках выдання часта з'яўляюцца матэрыялы пра асабістае жыццё футбаліста. Пасля гэтага газета запатрабавала ад Раналду афіцыйных прабачэнняў за абразу свайго журналіста. Тое ж самае патрабаванне выданне прад'явіла і федэрацыі футбола Партугаліі.

## ГРАНДЫ ЗБІЛІСЯ Ў КУЧУ

Новая формула чэмпіянату Еўропы аказалася па-сапраўднаму рэвалюцыйнай, дазволіўшы шматлікім дэбютантам і камандам «другога эшалона» не толькі прабіцца ў фінальны этап, але і атрымаць нядрэнныя шанцы на медалі турніру.

Схема плэй-оф спачатку здавалася досыць справядлівай. Аднак нераўнамернае размеркаванне топавых зборных унутры гэтых груп і нечаканыя сенсацыйныя вынікі прывялі да дзіўнага выніку. Сетка аказалася падзеленай на дзве паловы, зусім не параўнальныя па сіле і гістарычных заслугах камандаў.



У адной яе палове згуляюць паміж сабой дзейныя фіналісты Еўра — Іспанія і Італія, чэмпіёны свету немцы, французы і англічане, у другой сабраліся адразу некалькі сенсацый турніру — Венгрыя, Паўночная Ірландыя, Уэльс. У кампаніі апошніх такія моцныя еўрапейскія дружыны, як Бельгія, Харватыя ці Польшча маюць пэўны шанц, каб трапіць у фінал турніру, у той час як сярод грандаў еўрапейскага і сусветнага футболу «ў жывых застанецца толькі адзін». І тое не факт. Як бы там не было, усё пакажа гульня, а **пары ўдзельнікаў 1/8 фіналу атрымаліся наступныя:** Швейцарыя — Польшча, Уэльс — Паўночная Ірландыя, Харватыя — Партугалія (згуляюць **25 чэрвеня**), Францыя — Ірландыя, Германія — Славакія, Венгрыя — Бельгія **(26 чэрвеня),** Італія — Іспанія, Англія — Ісландыя **(27 чэрвеня).**

## ПРЭМІІ НЕ БУДЗЕ

Галоўны трэнер зборнай Украіны Міхаіл Фаменка заявіў, што яго падапечныя па выніках Еўра-2016 не атрымаюць прэміяльных. «Прэміяльныя плацяць за перамогу, а не за ўдзел», — цытуюць Фаменку СМІ. Украіна стала адзінай зборнай, якая не набрала на групавым этапе ачкоў і не забіла ніводнага гола. Падапечныя Фаменкі ўзначалілі рэйтынг горшых камандаў турніру, пакінуўшы на другім радку зборную Расіі.

## ПРАДКАЗАЛЬНІК З КААЛЫ НЕ ВЫЙШАЎ

У Германіі адхілілі ад абавязкаў каалу па мянушцы Обі-Обі, які няправільна прадказаў зыход футбольных матчаў нацыянальнай зборнай супраць Украіны і Польшчы ў рамках чэмпіянату Еўропы.



Насельнік заапарка Лейпцыга рабіў свае прароцтва, выбіраючы адну з дзвюх шклянак з галінкамі эўкаліпта і сцягамі краін, каманды якіх сустрэнуцца на полі. Обі-Обі прадказаў Германіі нічыю ў гульні з украінцамі і перамогу ў матчы з Польшчай. «Як сапраўдны няўдачнік, ён дае магчымасць рабіць прадказанні іншым. Свае сілы ён мае намер накіраваць на паяданне эўкаліпту», — адзначыў прадстаўнік звярынца.

**Іван КУПАРВАС.**

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.38 | 21.46 | 17.08 |
| Віцебск — | 4.19 | 21.44 | 17.25 |
| Магілёў — | 4.28 | 21.36 | 17.08 |
| Гомель — | 4.34 | 21.23 | 16.49 |
| Гродна — | 4.55 | 21.59 | 17.04 |
| Брэст — | 5.05 | 21.50 | 16.45 |

### Месяц

*Поўня 20.06–26.06.*
*Месяц у сузор'і Вадалея.*

### Імяніны

*Пр. Яфрэма.*
*К. Данута, Эміліі, Яніны, Барталамея, Вільма.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

# ЗАЎТРА




## Запрашальнік

## ПАДДАЦЬ ГАЗУ,

### ці Рэтра-падарожжа ў часе на матацыклах

**25 чэрвеня ў Заслаўі на вяслярным канале ўпершыню ў Беларусі адбудзецца першы спецыялізаваны рэтра-кірмаш і мота-кірмаш. Ён пройдзе ў рамках чацвёртага Міжнароднага рэтра-мота фестывалю «Кола Часу 2016». Апошні — фактычна тэхнічны музей аднаго дня.**

Гледачоў чакае разнастайная праграма, якая ўключае выставу не менш за 200 асобнікаў рэтраматацыклаў з 11 краін, якія «жывуцом» праедуць падчас шоу рэтраралі «Сябры». А яшчэ каля дзесяці музеяў і калекцыянераў прывязуць свае экспанаты, сярод якіх будуць сапраўдныя рарытэты. Такія, напрыклад, як Л-300 «Чырвоны кастрычнік», ІЖ-7 — першыя савецкія даваенныя матацыклы, ці трафейны Цюндап К-800. Арганізатары мерапрыемства запэўніваюць, што такога маштабу ва Усходняй Еўропе яшчэ не бачылі. Мінскі мотавелазавод прадставіць сваю калекцыю матацыклаў, якая, дарэчы, упершыню пакіне тэрыторыю прадпрыемства. Сярод іншых там будзе і легендарная двухцыліндравая мадэль М-101 — адзіны экземпляр, што захаваўся.

Уваход на фестываль для гледачоў платны: дарослы білет 100 тысяч, дзіцячы — 50 тысяч рублёў. Для дзяцей да 10 гадоў уваход вольны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Даты | Падзеі | Людзі

### 24 ЧЭРВЕНЯ

**1881** год — 135 гадоў таму нарадзіўся Рыгор Іванавіч Катоўскі, савецкі военачальнік. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года. У 1918-м на чале партызанскага атрада ваяваў з румынскімі, аўстрыйскімі і германскімі акупацыйнымі войскамі ў Бесарабіі. Кіраваў ваенна-дыверсійнай дзейнасцю падполля ў Адэсе. З 1919 года камандзір стралковай і кавалерыйскай брыгад, кавалерыйскай дывізіі ў Чырвонай Арміі. Загінуў у жніўні 1925 года пры нявысветленых абставінах ад выстралу свайго знаёмага Меера Зайдэра. Забойца, дарэчы, не хаваўся ад следства і адразу заявіў пра ўчыненае злачынства. У жніўні 1926 года ён быў асуджаны на 10 гадоў зняволення. Знаходзячыся ў турме, практычна адразу ж стаў начальнікам турэмнага клуба і атрымаў права вольнага выхаду ў горад. Ужо праз два гады Зайдэр быў вызвалены з фармулёўкай «за прыкладныя паводзіны». Восенню 1930 года быў забіты трыма ветэранамі дывізіі Катоўскага. У даследчыкаў ёсць падставы меркаваць, што кампетэнтныя органы мелі інфармацыю пра мяркуемае забойства Зайдэрам Катоўскага. У Вялікую Айчынную вайну на тэрыторыі Беларусі імя Катоўскага насіла 161-я партызанская брыгада і больш за 20 партызанскіх атрадаў.



**1900** год — нарадзіўся (вёска Жабчава, цяпер у Капыльскім раёне) Кузьма Чорны (Мікалай Карлавіч Раманоўскі), беларускі пісьменнік. З 1923 года — член літаратурнай суполкі «Маладняк», у 1926—1931 гадах — старшыня літаратурнага аб'яднання «Узвышша». У 1938 годзе быў неабгрунтавана арыштаваны. Да чэрвеня 1939 года знаходзіўся ў мінскай турме. З 1941 года быў у эвакуацыі ў Маскве, удзельнічаў у выданні газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». Пасля вызвалення Мінска вярнуўся ў сталіцу, працаваў у часопісе «Беларусь». Аўтар раманаў «Зямля», «Радзіма», «Трэцяе пакаленне», апавяданняў «Лявон Бушмар», «Люба Лук'янская», шматлікіх апавяданняў. Выступаў таксама ў жанры драматургіі. Пераклаў на беларускую мову многія творы А. Пушкіна, М. Гогаля, М. Горкага, Я. Гашэка і інш. Памёр у 1944 годзе.

**1941** год — 75 гадоў таму, праз два дні пасля пачатку вайны, адначасова ў газетах «Известия» і «Красная звезда» быў апублікаваны верш паэта Васіля Лебедзева-Кумача «Священная война». Адразу ж пасля публікацыі кампазітар Аляксандр Аляксандраў напісаў да іх музыку. Песня адыграла велізарную ролю ў мабілізацыі савецкага народа на адпор гітлераўскай агрэсіі. Праз некалькі дзён яна гучала ў Маскве, на Беларускім вакзале, перад байцамі, якія ад'язджалі на фронт.

### Было сказана

**Сяргей ГРАХОЎСКІ, паэт:**

*«Хоць не забылі б сейбітавы дзеці,*
*Што сіла — ў сіле роднае зямлі».*

## УСМІХНЕМСЯ

— Мама, можна сабаку ўзяць дадому?
— А яна добра есць?
— Так, мамуль, проста выдатна!
— Тады нельга.

**Мільёны людзей у нашай краіне не ўмеюць гуляць у футбол, але толькі гульцы зборнай робяць гэта за такія вялікія грошы.**

Яна і ён.
— Я тоўстая?
— Не.
— Але пахудзець не перашкодзіла б, так?
— Ты мне і такая падабаешся.
— Але захапленне не выклікаю, так?
— Выклікаеш захапленне.
— Але не шалёнае, так?..

**На самай справе бясконца можна глядзець шмат на што.**
**Галоўнае — ляжаць пры гэтым на канапе.**




Малюнак Вікенція ПУЗАНКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.081. Індэкс 63850. Зак. № 2430.

Нумар падпісаны ў 19.30 23 чэрвеня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12